Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 СТУДЗЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 4 (28114) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Мулявін, які заўсёды будзе**

СТАР. 4

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Пра налічэнне пенсіі ў краінах ЕАЭС**



**Мастак без адукацыі? Гэта магчыма**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«Плацяжы індывідуальных прадпрымальнікаў складаюць каля 2% ад усіх падатковых паступленняў. Гэта нязначная доля, але мы і не разлічваем на істотныя паступленні ад малога бізнесу. Сёння задача нашага ведамства заключаецца ў стварэнні ўмоў для добрасумленных суб'ектаў гаспадарання, каб яны своечасова выконвалі свае абавязацельствы па выплаце падаткаў. Трэба прызнаць, мы не да канца стварылі зручныя ўмовы для падаткаплацельшчыкаў, каб выкананне імі сваіх абавязацельстваў было незатратным. Але я хацеў бы адзначыць законапаслухмянасць нашых грамадзян і суб'ектаў гаспадарання ў гэтай сферы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19048,00 | ▲ |
| Еўра | 20737,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 250,21 | ▼ |
| Укр. грыўня | 794,18 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# МАРОЗ ФУТБОЛУ — НЕ ПЕРАШКОДА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сацыяльная кансультацыя

## ПЕНСІЮ ТРЭБА ЗАРАБЛЯЦЬ

### Чым страхавы стаж працы адрозніваецца ад агульнага працоўнага?

**Як пісала ўжо «Звязда», з 1 студзеня гэтага года мінімальны страхавы стаж, неабходны для пенсіі па ўзросце, павялічаны да 15 гадоў 6 месяцаў. А пачынаючы з 1 студзеня 2017-га ён паступова будзе павялічвацца штогод на 6 месяцаў да дасягнення 20 гадоў.**

**Больш падрабязна пра тое, што такое страхавы стаж, нам расказала начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена ДРОНАВА.**

***Што такое страхавы стаж?***

Страхавы стаж — гэта час працы, прадпрымальніцкай, творчай і іншай дзейнасці з платай страхавых узносаў. У такі стаж уключаюцца ўсе гады, у тым ліку і ў перыяд СССР.

Страхавы стаж дае правы на атрыманне пенсіі. Працоўны стаж улічваецца пры вылічэнні памеру пенсіі. У агульны працоўны стаж, акрамя перыядаў работы з выплатай страхавых узносаў (гэта значыць страхавога стажу), залічваюцца і так званыя «крэдытныя» перыяды (без выплаты страхавых узносаў): ваенная служба, догляд дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў, догляд інваліда 1 групы, атрыманне адукацыі ў дзённай форме навучання, атрыманне дапамогі па беспрацоўі і інш.

Патрабаванне аб мінімальным страхавым стажы для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце (5 гадоў) было ўстаноўлена ў заканадаўстве яшчэ ў 2006 годзе.

***Чаму не трэба баяцца павелічэння перыяду страхавога стажу?***

Мера па павелічэнні мінімальнай працягласці страхавога стажу не павінна выклікаць занепакоенасці ў грамадзян. Бо за працяглы перыяд іх працоўнай актыўнасці (ад 18 да 55/60 і больш гадоў у жанчын/мужчын адпаведна) адпрацаваць 20 гадоў з выплатай узносаў цалкам рэальна.

Гэты захад арыентуе на тое, што пенсію неабходна зарабляць. Адрасавана яна больш маладым работнікам і загадзя нацэльвае іх на неабходнасць фарміравання сваіх пенсійных правоў.

***Ці набываюць страхавы стаж беларусы, якія працуюць у замежнай арганізацыі?***

Так, грамадзяне Беларусі, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія працуюць у прадстаўніцтвах замежных арганізацый, што ажыццяўляюць сваю дзейнасць на тэрыторыі рэспублікі, набываюць страхавы стаж.

З 1 студзеня гэтага года абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае (пенсійнае) страхаванне таксама распаўсюджваецца на замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія працуюць у Беларусі ці з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

СТАР. 2

■ Стыхія

## ЦЫКЛОН З АРАНЖАВЫМ УЗРОЎНЕМ НЕБЯСПЕКІ

### Сіноптыкі гэтымі днямі настойліва рэкамендуюць перасесці з уласнага на грамадскі транспарт, а часам і ўвогуле адмовіцца ад смелых падарожжаў

**Калі мінулы год мы праводзілі пры анамальна цёплых тэмпературах, то першыя дні студзеня адзначыліся ўжо сур'ёзнымі халадамі, паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

### ТЫДЗЕНЬ АНАМАЛЬНАГА ХОЛАДУ

У першай дэкадзе студзеня сярэдняя тэмпература паветра была на 4—9 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Сапраўды вельмі халодным стаў менавіта першы тыдзень года. Сіноптыкі нават падлічылі, што такія маразы ў гэты час бываюць прыкладна раз у 25—30 гадоў. А на гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі прыйшоў снег і пацяплела.

СТАР. 3